***Т.І. Борбат, І.М. Ячмянёва***

# ПАЭМА П. БРОЎКІ «ПРАЗ ГОРЫ І СТЭП»: СПРОБА ПЕРААСЭНСАВАННЯ

У 1930-я гады П. Броўка звяртаецца да паэтычнага эпасу. Этапным для паэта творам стала паэма «Праз горы і стэп» (1932), напісаная «паводле матэрыялаў Самарскай дывізіі». У абагульненай карціне цяжкага паходу перад чытачом паўстае маналітная, адзіная «па веры і гарту» людская грамада, нястрымная ў імкненні да перамогі. І ніякія суровыя выпрабаванні не здольны спыніць яе. Гэту нястрымнасць, імклівы рух паэт перадае дынамічным, «маршавым» па сваёй рытмічнай структуры гучаннем верша: *«На коней, брат! // Там белы гад! // Мацней агонь! // Дабіць яго! // І пайшлі, // Маладымі і новымі, // І пайшлі, // Ажно вецер прысеў»* [1, с. 189]. У паэме, як і ў многіх ранніх вершах, відавочная творчая арыентацыя П. Броўкі на традыцыі У. Маякоўскага. Малады паэт імкнецца дасягнуць маштабнасці, прамоўніцкай гучнасці, захапляецца эфектнымі рыфмамі, перарывістымі рытмамі.

Апавяданне ў паэме вядзецца ад імя радавога ўдзельніка паходу. Герой распавядае аб перажытых цяжкасцях па-салдацку адкрыта, нават грубавата («распетрылі чэрці нас», «да зубоў злосць пераела ўсіх нас»). Маналогі байца ўнутрана ўсхваляваныя, часам драматычныя. Паэт шырока карыстаецца прыёмамі гіпербалізаванага, абагулена-рамантычнага асвятлення гістарычных падзей. Знямоžаныя голадам чырвоныя байцы вытрымалі і шматлікія атакі белагвардзейцаў, і тыфозную агонію, і «раз'юшаны рогат» буруна, выйшлі пераможцамі: *«Мы ж прайшлі гэта пекла, // Хоць і шмат пагублялі <...> // Яшчэ больш гартаванымі // У полымі сталі»*[1, с. 191]. Былыя грозныя паходы паўстаюць цяпер перад героем у арэоле славы і гераізму. Гераічнае, раскрытае праз трагедыйнае, набывае ў творы «асабліва моцную эмацыянальную сілу мастацкага ўздзеяння» [2, с. 34].

Такім чынам, П. Броўка стварыў самабытную і пранікнёную паэму аб гераізме радавых удзельнікаў рэвалюцыі. І, нягледзячы на пэўную рыторыку і ілюстрацыйнасць, такія творы, безумоўна, спрыяюць асэнсаванню і разуменню сутнасці часу і рамантыкі 1920-х гадоў. Таму было б марнатраўствам «спісаць у літаратурны архіў усё тое, што так звонка гучала, натхнялася часам і натхняла час»[3, с.13].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. *Броўка П.* Збор твораў: у 4 т. – Мн., 1965. – Т.1. Вершы, паэмы: 1926 – 1940.
2. *Ярош М.* Пятрусь Броўка: Нарыс жыцця і творчасці. – Мн., 1983.
3. *Бечык В.* Прад высокаю красою…: Літ.-крытыч. арт. – Мн., 1984.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова